# Да чытача

Кніга, якую мы прапануем добразычлівай увазе гісторыкаў і аматараў беларускай мінуўшчыны, мае і сваю ўласную перадгісторыю. Думка аб выданні зборніка навуковых прац у памяць пра выдатнага айчыннага гісторыка Паўла Алегавіча Лойку з'явілася ўжо неўзабаве пасля яго заўчаснай смерці. Ідэя была горача падтрыманая многімі, але рэалізацыя задумы аказалася не такой лёгкай справай. Па розных прычынах збор матэрыялаў і падрыхтоўка кнігі да друку ішлі вельмі марудна. І тым не менш, справа даведзена да завяршэння, зборнік выйшаў у свет.

Перш чым гаварыць пра кнігу, скажам пра чалавека, памяці якога яна прысвечана. Паўла Алегавіча Лойку добра ведалі і любілі ў нашай краіне. Ён быў аўтарам шматлікіх навуковых публікацый, некалькіх школьных падручнікаў і дапаможнікаў, частым госцем на тэлебачанні і радыё, адной з самых яскравых постацей у Інстытуце гісторыі Акадэміі навук Беларусі, вельмі папулярным выкладчыкам гістарычнага факультэта БДУ. Павел Алегавіч пакінуў шматлікіх вучняў, і яшчэ больш людзей сталі дзякуючы яму аматарамі беларускай гісторыі. І гэта не дзіўна: Павел Алегавіч быў шчыра захоплены сваёй любімай справай, меў вялікі папулярызатарскі талент і быў сапраўдным патрыётам сваёй Бацькаўшчыны. Павел Алегавіч быў прызнаным вучоным-гісторыкам, спецыялістам у сваёй галіне, які пакінуў вялікую навуковую спадчыну. Але, што не менш важна, ён пакінуў па сабе і самую лепшую чалавечую памяць. Гэта быў надзвычай добры, вясёлы, светлы чалавек, які шчыра любіў людзей, лёгка ішоў на кантакт, шмат каму дапамог у жыцці. Паўлу Алегавічу адказвалі шчырай узаемнай сімпатыяй і ўдзячнасцю: ён меў шмат сяброў і добрых знаёмых. Яны – сярод аўтараў гэтага зборніка.

У пераважнай сваёй большасці артыкулы, якія ўвайшлі ў выданне, прысвечаны розным аспектам гісторыі Беларусі эпохі Сярэднявечча і Ранняга Новага часу. Гэтую акалічнасць асабліва хацелася б адзначыць, бо П.А. Лойка займаўся перш за ўсё перыядам Ранняга Новага часу: XVI–XVIII стагоддзямі. У апошнія гады свайго жыцця ён асабліва актыўна распрацоўваў праблематыку, якая была звязана з грамадска-палітычнай дзейнасцю беларускай шляхты ў другой палове XVI – першай трэці XVII стагоддзяў. Як можна зразумець па гэтым зборніку, Павел Алегавіч займеў тут немалую колькасць паслядоўнікаў і калег па даследчыцкай праблематыцы. Гэтай эпосе і гэтай тэматыцы ў большай ці меншай ступені прысвечаны адразу пяць артыкулаў – палова ад усіх, змешчаных у зборніку. Думаецца, што гэта зусім не выпадковае супадзенне – уплыў навуковых даследаванняў Паўла Алегавіча, напісаных ім падручнікаў і яго выкладчыцкай працы на маладзейшае пакаленне нашых гісторыкаў тут адчуваецца надзвычай выразна. Зазначым, што і ў замежных даследаваннях апошніх 20–25 гадоў гэты перыяд знаходзіць усё шырэйшае і ўсё больш падрабязнае сваё асвятленне.

Аднак, нягледзячы на відавочны прагрэс, які беларуская гістарычная навука зрабіла цягам апошніх гадоў, вельмі многія сюжэты айчыннай гісторыі эпохі Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай усё яшчэ застаюцца практычна незакранутымі ў нашых працах. Многія факты і меркаванні былі ўспрыняты беларускімі даследчыкамі хутчэй як даніна традыцыі, успрыняты без належнага асэнсавання, некрытычна і існуюць сёння ў большай ступені як гістарыяграфічныя з'явы. Але пры больш уважлівым разглядзе высвятляецца, што яны патрабуюць новага апісання і новых ацэнак. Тым больш, што часам гэтыя факты і меркаванні выходзяць па-за межы чыста навуковай сферы і займаюць сваё месца ў жыцці грамадскім, палітычным, рэлігійным, культурным і г.д. А ўвогуле, на прыкладзе артыкулаў зборніка мы ў чарговы раз пераконваемся, што перад намі ляжыць сапраўды бязмежнае поле яшчэ неапрацаванай гістарычнай інфармацыі, якая патрабуе належнай сістэматызацыі, асэнсавання, інтэрпрэтацый.

Зборнік атрымаўся досыць разнастайным па закранутых праблемах, а таксама па прадстаўленых у ім даследчыцкіх парадыгмах, падыходах і методыках. Тут можна знайсці і працы, выкананыя ў традыцыйным, пазітывісцкім, стылі, і наватарскія штудыі. Аднак пераважную большасць артыкулаў можна ахарактарызаваць усё ж як даследаванні факталагічнага плана. Нездарма ж у спісах выкарыстаных крыніц і даследаванняў архіўныя адзінкі захавання нярэдка колькасна пераважаюць – а ў некаторых выпадках пераважаюць абсалютна. Наша гістарыяграфія ўсё яшчэ знаходзіцца на этапе назапашвання фактычнага матэрыялу. Канешне ж, гэта зусім неабходная праца, якая пашырае, паглыбляе і дэталізуе нашы веды. Але некаторыя артыкулы зборніка прыкметна кантрастуюць з большасцю астатніх, яскрава дэманструючы, якімі яшчэ шляхамі можа рухацца наперад беларуская гістарычная навука.

І яшчэ адно: аўтарамі ўсіх без выключэння артыкулаў зборніка з'яўляюцца маладыя вучоныя, узрост якіх абмяжоўваецца 30–40 гадамі. Тым не менш, усе гэтыя працы выкананыя на вельмі добрым навуковым узроўні. Таму, думаецца, мы маем усе падставы для таго, каб сцвярджаць, што медыевістычныя даследаванні і даследаванні па гісторыі Беларусі мадэрных часоў маюць добрыя перспектывы. І варта падкрэсліць, што актыўнае вывучэнне гэтых эпох у найноўшай беларускай гістарыяграфіі было адноўлена і актывізавана ў многім дзякуючы нястомнай працы рамантычнага рыцара беларускай гістарычнай навукі Паўла Лойкі.

На заканчэнне хацелася б выказаць падзяку Валянціну Голубеву за дапамогу ў зборы матэрыялаў для гэтай кнігі.

*Васіль Варонін*